**Н. Ф. Гікало**

**сакратар ЦК КП(б)Б**

# Даб'емся высокага ўраджаю

Беларусь скончыла сяўбу 23 мая. Гэтым самым яна вышла ў шарэнгу перадавых абласцей і краёў. *К 25 мая рэспубліка перавыканала дадатковы план сяўбы зернавых у 65 тысяч гектараў і закончыла сяўбу ільну.*

У 1932 годзе веснавая сяўба цягнулася да паловы чэрвеня і ўсё-ж план сяўбы не быў выканан. У 1933 годзе сяўба цягнулася да 20 чэрвеня. Параўноўваючы даныя сяўбы гэтага года з папярэднімі двума гадамі, выразна бачыш, што найшырэйшыя масы калгаснікаў чэсна, па-гаспадарску адносяцца цяпер да калгаснай працы. Партыйныя і совецкія арганізацыі Беларусі ў гэтым годзе лепш працавалі, лепш кіравалі калгаснай вытворчасцю, навучыліся больш глыбока і ў той-жа час больш канкрэтна падыходзіць да кожнага пытання.

Характэрнай асаблівасцю сёлетняй веснавой сяўбы з'яўляецца яе роўнамернасць. Амаль адначасова ўсе раёны к 20 мая закончылі сяўбу, адставалі толькі некалькі раёнаў.

Асабліва важнай акалічнасцю мы лічым тое, што аднаасобнікі ў гэтым годзе следавалі па тэмпах сяўбы за калгасамі. Гэтаму спрыяла ўказанне ЦК ВКП(б) у пачатку красавіка на нездавальняючае становішча работы з аднаасобнікамі ў некаторых раёнах Беларусі (Магілеў, Гомель, Жлобін). ЦК КП(б)Б падняў на ногі ўсю партарганізацыю і дабіўся рашучага паляпшэння работы з аднаасобнікам.

У часе сяўбы па ўсёй Беларусі мы мелі значны прыліў аднаасобнікаў у калгасы. У некаторых раёнах, напрыклад, у Рагачоўскім, амаль падвоіўся процант калектывізацыі.

Неабходна адзначыць сціслыя тэрміны сяўбы такіх культур, як лён і авёс. План пасеву ільну к 15 мая 1934 года быў выканан на 94 проц., тады як у 1933 годзе к 15 мая план быў выканан толькі на 30 проц. Сяўба яравых зернавых 15 мая 1934 года закончана з перавышэннем на 5,5 проц., а ў 1933 годзе на тое-ж чысло было выканана 51,8 проц.

Веснавая сяўба 1934 года знамянуе сабой пералом у вёсцы Совецкай Беларусі, паказаўшы небывалыя раней тэмпы і якасць сяўбы. Сяўба 1934 года прайшла, па-першае, пад знакам масавага соцыялістычнага спаборніцтва, у якое былі ўцягнуты раёны, сельсоветы, калгасы, брыгады і радавыя калгаснікі. Сяўба 1934 года прайшла, па-другое, пад знакам разгорнутай барацьбы за якасць сяўбы. Барацьба за якасць стала здабыткам мас. У камісіях па якасці прымалі ўдзел дзесяткі тысяч людзей. У гэтым факце ярчэй за ўсё адлюстроўваюцца новыя адносіны сялянскіх мас да калектывізацыі і калектыўнай працы, да рэзультатаў сваёй працы. Радавы калгаснік ужо зразумеў, што калгас— яго родная справа. Таму так бязлітасна і сурова змагаецца калгасная маса з бракаробамі.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі